# Уладзімір Караткевіч «Дзікае паляванне караля Стаха»

Урок беларускай літаратуры ў 9 класе

**В. А. Зарэцкая,**
настаўнік беларускай мовы і літаратуры першай катэгорыі
СШ № 1 г. Лепеля

**Тэма:**

Роздум аб прызначэнні  чалавека на зямлі, аб лёсе беларускага народа ў аповесці У. Караткевіча «Дзікае паляванне караля Стаха». Вобразы Андрэя Беларэцкага, Андрэя Свеціловіча і Надзеі Яноўскай

**Мэты:**

1) адукацыйная: стварыць умовы для разумення ідэйна-мастацкага зместу аповесці, садзейнічаць развіццю навыка аналізу празаічнага твора праз характарыстыку вобразаў аповесці, вызначэнне іх ролі ў паказе аўтараскай пазіцыі;

2) развіццёвая:  развіваць уменне выяўляць асноўныя праблемы твора, навыкі выбарачнага пераказу, стварыць умовы для развіцця творчых здольнасцей вучняў, уменне аргументаваць свой пункт погляду;

3) выхаваўчая: стварыць умовы для выхавання на ўроку патрыятычных пачуццяў, уважлівага стаўлення да чалавечай асобы, духоўна-маральнай культуры, спрыяць выхаванню ўдумлівага чытача.

**Тып урока**: *абагульненне і сістэматызацыя ведаў*

**Месца ўрока ў тэме**: другі ўрок

**Плануемы вынік**: напрыканцы ўрока вучань будзе

- ведаць: параўнальную характарыстыку герояў аповесці па іх паводзінах, учынках, выказваннях;
- разумець: ролю кожнага вобраза ў раскрыцці ідэйна-мастацкага зместу аповесці, аўтарскую пазіцыю ў дачыненні да герояў.

**Асноўны метад**: павобразная характарыстыка герояў твора

**Міжпрадметныя сувязі**:  музыка, кіно, выяўленчае мастацтва, гісторыя Беларусі

**Абсталяванне:** карткі з тэставым заданнем, мультымедыйная прэзентацыя

## Ход урока

«Без гістарычнай літаратуры не
можа абудзіцца нацыя, бо няма нацыі
без пачуцця гістарызму»
Ул. Караткевіч

**1. Арыентацыйна-матывацыйны этап**

Дыдактычныя задачы: стварыць умовы для камунікацыі, псіхалагічнай падрыхтоўкі вучняў да ўрока, да ўспрымання і аналізу інфармацыі.

**2. Пастаноўка задач урока**

- На мінулым занятку мы з вамі склалі план характарыстыкі героя апавядання ў выглядзе інтэлек-карты. Якое дамашняе заданне вы атрымалі?
- Чаму ўсе вучні ўмоўна былі падзелены на тры групы? (тры героі для характарыстыкі)
- Як вы думаеце, якая мэта нашага сённяшняга ўрока? (даць характарыстыку героям, вызначыць асноўныя рысы характару)
- Што дасць нам дэтальны аналіз кожнага з прапанаваных вобразаў? (больш поўна зразумець ідэю твора, аўтарскую задумку)
- **Эпіграф**. Раю вам звяртацца да эпіграфа на працягу ўсяго ўрока і суадносіць яго са зместам нашай гутаркі.

**3. Узнаўленне раней атрыманых ведаў**

- У якасці літаратурнай размінкі я прапаную вам выканаць тэставае заданне, якое знаходзіцца на кожнай парце. Тэст складзены на аснове зместу аповесці «Дзікае паляванне караля Стаха». Працуем у парах. Картку з заданнем падпішыце. На запаўненне дадзена 3 хвіліны. Пачынайце.

(Некалькі картак па жаданні вучняў збіраюцца, праверка праводзіцца франтальна з дапамогай прэзентацыі.)

*У якасці фону гучыць музыка Яўгена Глебава з кінафільма «Дікае паляванне караля Стаха».*

1. Назва маёнтка, дзе адбываюцца падзеі:

а) Палац Радзівілаў; б) Балотныя Яліны; в) Волатава прорва.

2. Да якога пакалення па легендзе быў пракляты род Яноўскіх?

а) да 20; б) да 3; в) да 13.

3. Кім па прафесіі быў А.Беларэцкі?

а) фалькларыст; б) настаўнік; в) археолаг.

4. Агульнае ў знешнім выглядзе ўпраўляючага і Малога Чалавека:

а) позірк; б) рост; в) рукі.

5. Кім на самой справе аказалася Блакітная Жанчына?

а) Надзея Яноўская; б) ахмістрыня; в) пані Кульша.

6. Хто аўтар запіскі: «Тое, чаму трэба, загіне. Ты лёзны чалавек, чужынец…Сыходзь з дарогі»?

а) Берман; б) Варона; в) Дубатоўк

7. Каго сустрэў Свеціловіч ля Ведзьмаковай ступы?

а) Рыгора; б) Варону; в) Дубатоўка.

8. Хто быў арганізатарам дзікага палявання?

а) Лікол; б) Варона; в) Дубатоўк.

9. Як завецца старажытная парода коней?

а ) арлоўскі рысак;   б) тарпан;     в) дрыкгант.

10. Як загінуў Дубатоўк?

а) згарэў у сваім маёнтку; б) затапталі коні;   в) застрэліўся.

1. б. 2. в. 3. б. 4. а, б. 5. в. 6. 1в, 2б, 3а. 7. б. 8. а. 9. 10. а.

**4. Павобразная характарыстыка герояў**

Наша ітэлект-карта складалася з 5 пунктаў. Да таго ж кожная група рыхтавала творчае заданне для прэзентацыі свайго вобраза. Сёння мы звернем увагу на вобразы Надзеі Яноўскай, Андрэя Беларэцкага і Андрэя Свеціловіча. Працаваць будзем франтальна: кожны **пункт плана** на прыкладзе кожнага вобраза. Пункт 1. Уступім месца даме.

| Прозвішча героя *(«гаворачае імя»),* знешнасць | | |
|---|---|---|
| **Надзея Яноўская** | **Андрэй Беларэцкі** | **Андрэй Свеціловіч** |
| <u>Дакументальны партрэт:</u><br>18 год, прадстаўніца выміраючага шляхецкага роду Яноўскіх. Гаворачае імя. Прозвішча мяккае – тры [й ]<br>«Маленькая ростам, худзенькая, танюткая, як галінка, з блакітнымі жылкамі на шыі і на руках. Яна была слабай, як сцяблінка **палыну** на мяжы. Прычоска нейкая незразумелая. Рысы твару невыразныя»<br><u>Удакладняючыя пытанні настаўніка:</u><br>**- Якія характарыстыкі спачатку дае Яноўскай Беларэцкі?** («проста заморыш, дзіцёнак, д’ябальскі непрыгожая, жывы труп, яна была неразбуджаная, зусім халодная, як лед; нябога была б, можа, і нядрэнная сабою, каб не гэты ўстойлівы, цёмны страх; жах псаваў ёй аблічча»).<br>**- Калі ўпершыню ўбачыў яе іншай, прывабнай, жывой? (**калі гаварыла пра сваіх продкаў і іх несправядлівыя адносіны да народа – «прыгожая дзіўнай, трохі **вар’яцкай** прыгажосцю»).<br><br>**- Як вы думаеце, ці была Надзея на самай справе прыгожай? Ці адчувала гэта сама? Чаму не?** | 26 год, фалькларыст, апісання знешнасці няма, прозвішча Беларэцкі мае асацыяцыю з Беларуссю | Аднолькавае імя з Беларэцкім, прозвішча Свеціловіч сімвалізуе свет, надзею на добрую, высакародную шляхту<br>Адзін з нашчадкаў Яноўскіх, удзельнічаў у паўстанні ва ўніверсітэце |

| Самахарактарыстыка | | |
|---|---|---|
| **Надзея Яноўская** | **Андрэй Беларэцкі** | **Андрэй Свеціловіч** |
| «Раман у дваццатым калене», апошняя з | Для мяне ў той час найбольш важна было | Ставіцца да сябе з іроніяй, не цэніць сваё жыццё, |

| | | |
|---|---|---|
| Яноўскіх (паставіла крыж на сабе, лічыла пакаранне справядлівым).<br>«Зямля не для мяне…. я ненавіджу тых, хто жэніцца».<br>**- Адкуль такая нізкая самаацэнка?** | зразумець, хто я, якім багам паівнен маліцца. Я тады шукаў свой народ і пачынаў разумець, што ён тут, побач».<br>Баяўся палявання (прызнаваўся сабе ў гэтым, нават напачатку хацеў збегчы) | наіўна-аптымістычны |

| Адносіны да Бацькаўшчыны, яе гісторыі і будучыні | | |
|---|---|---|
| **Надзея Яноўская** | **Андрэй Беларэцкі** | **Андрэй Свеціловіч** |
| «Гэты свет вабіць, але я непатрэбная нідзе, акрамя гэтых Балотных Ялін».<br>«Мне здаецца, што нідзе няма сонца».<br>**- Ці можна яе асуджаць за такі песімізм да жыцця і краіны? Чаму?** | Усведамляе сябе менавіта беларусам (збірае фальклор, хоча захаваць спадчыну, больш глыбока пазнаць народ).<br>За два гады аб’ехаў Мінскую, Магілёўскую, Віцебскую і частку Віленскай губерній.<br>Беларусь для яго – этнаграфічны рай. «Не ведаю як вам, а мне заўсёды шкада пакідаць гэты край» | Перажывае за лёс Радзімы: «Ганебны гандаль радзімай на працягу сямі стагоддзяў».<br>Намагаецца адстаяць правы радзімы на самастойнасць, верыць у справядлівасць, імкнецца да яе |

| Адносіны да народа, да шляхты | | |
|---|---|---|
| **Надзея Яноўская** | **Андрэй Беларэцкі** | **Андрэй Свеціловіч** |
| З’яўляючыся прадстаўніцай высокага саслоўя, ставіцца да гэтага факту негатыўна, называе сваё сацыяльнае становішча «абузай, абавязкам». Але ў паводзінах адчуваецца прыроджаная чалавечая годнасць. Няма мяжы паміж ёй і народам, не глядзіць звысака, спачувае.<br>- **Як выказваецца пра сваіх продкаў?**<br>- **Як паступае са сваім палацам пасля ад’езду?**<br>- **Як ставіцца да Рыгора, да ахмістрыні?** | Здольны бачыць праўдзівасць рэчаў.<br>Канстатуе адміранне шляхты. Спачувае сялянам: «І паўсюль я бачыў гора народнае».<br>Любоў Беларэцкага да народа дзейсная – дапамога, абарона.<br>«Калі не з мужыкоў, дык каля мужыкоў блізка ляжаў» (Рыгор) | Саромеецца, што належыць да шляхты: «Каб была мая воля, я б выпусціў з жылаў магнацкую сваю кроў. Гэта толькі прычына да вялікіх пакут сумлення».<br>Перажвае пра народ: «Краіна аддае чужынцам лепшых сваіх сыноў».<br>Клапоціцца пра сялян: «Свеціловіч таксама панам быў, а вас ад шляхты ды ад суддзяў абараняў», чатырох мужыкоў з суда выбавіў |

| | | |
|---|---|---|
| Рысы характару, паводзіны ў крытычнай сітуацыі | | |
| **Надзея Яноўская:** | **Андрэй Беларэцкі** | **Андрэй Свеціловіч** |
| Высакародная, умее даравоць, дарослая для сваіх 18 год, наіўная, смелая, рамантычная, не ставіць сябе вышэй за астатніх | Смелы, вытрыманы, мае аналітычнае мысленне, добрую фізічную падрыхтоўку, часам нават жорсткі (суд, расправа над дзікім паляваннем), ігрок, ідзе ва-банк, падазрае ўсіх, высакародны (хоча абараніць слабых, дуэль), умее пастаяць за сябе. «Гэта не кураня – гэта мужчына». (Дубатоўк) | «Чысты і харошы чалавек» ( так характарызуе яго А.Беларэцкі). Даверлівы, вельмі выхаваны і асцярожны ў выказваннях, здольны да самаахвяравання |

**6. Творчае заданне . Па жаданні вучні малявалі партрэт свайго героя.**

**5. Гульня «Пра каго ідзе размова» (**з элементамі фізкультхвілінкі: калі гэта ваш герой, трэба ўстаць)

1. «Спіць і бачыць сябе гаспадаром вялізнага замка» (Дубатоўк)

2. Чые гэта словы? «Мазгоў з напарстак, а сківіцы як у дыназаўра, на семсот зубоў. Топчуць маленькіх, прадаюць сумленне» (Свеціловіч)

3. «Пра цябе казалі, што Яноўскую, калі яна сіратой засталася, шкадаваў, нават хацеў вартаўніком да яе перайсці» (селянін Рыгор)

4. «Абкладзеная з усіх бакоў, яна не страціла лепшых сваіх якасцей: спагадлівасць, дабрыню, самаахвярнасць» (Яноўская Надзея)

5. «Мая гордасць – маё адзінае, я не даю нікому наступіць сабу на нагу» (Беларэцкі)

6. Не згаджаўся спачатку забіваць Яноўскую, але пасля з'ўлення Свеціловіча згадзіўся і ён. (Варона)

**6. Гульня «Асацыяцыі « (Скрайбінг)**

- А зараз я прапаную вам пагуляць у гульню «Асацыяцыі». Умова такая: я называю пэўную з'яву, а вы прыдумваеце прыклад, які б падыходзіў да вашага персанажа. Напрыклад, Беларэцкі: калі пабудова, то крэпасць.

Калі кветка, то… (колер, дрэва, музыка, зброя, пара года)

**7. Абагульняючая гутарка**

- Чаму ўсе, што адбываецца ў творы, мы бачым вачамі менавіта Беларэцкага?
- Чаму ў герояў аднолькавыя імёны? Не было іншых?
- Чаму Яноўская не раз прапаноўвала Беларэцкаму з'ехаць адсюль?
- Дзе мы маем любоўны трохкутнік? Ці вострыя там вуглы? Чаму?
- Як лёс узнагароджвае Яноўскую за яе пакуты?

- Што абя'дноўвае ўсіх траіх персанажаў? (імкнуцца змяніць жыццё да лепшага, сумленныя, маладое пакаленне)

- Чаму аўтар «забівае» аднаго з любімых персанажаў?

- Чаму Караткевіч узяў менавіта гістарычную тэматыку ў аповесці? (зварот да эпіграфа)

- Ці дасягнулі мы пастаўленых задач? Сувязь з эпіграфам.

**8. Рэфлексія.**

- У які гістарычны час адбываюцца падзеі ў аповесці?

- Вы б хацелі жыць у той час? Чаму? Якія пачуцці выклікалі ў вас героі?

- Паэт Валянцін Берастаў лічыў, што «пісьменнік, які імкнецца атрымаць званне класіка, павінен стварыць новы вобраз у літаратуры, а яшчэ лепш – цэлую галерэю вобразаў». Ці можна аповесць лічыць класікай?

**10. Дамашняе заданне. Зрабіць групоўку вобразаў, засноўваючыся на тэме «Праблема дабра і зла ў аповесці».**

## Уладзімір Караткевіч

# “Дзікае паляванне караля Стаха”

# Задачы ўрока:

- ахарактарызаваць герояў аповесці па іх паводзінах, учынках, выказваннях;
- вызначыць ролю вобразаў у раскрыцці ідэі твора.

# Літаратурнае тэставае заданне







???

# Літаратурнае тэставае заданне

**Адказы:**

1. б) Балотныя Яліны
2. а) да 20
3. а) фальклaрыст
4. в) рукі
5. а) Надзея Яноўская
6. а) Берман
7. б) Варону
8. а) Лікол; в) Дубатоўк
9. в) дрыкгант
10. б) затапталі коні

# План характарыстыкі героя

1. Прозвішча героя, знешнасць
2. Самахарактарыстыка
3. Адносіны да Бацькаўшчыны, яе гісторыі і будучыні
4. Адносіны да народа, да шляхты
5. Рысы характару, паводзіны ў крытычнай сітуацыі

# 1. Прозвішча героя, знешнасць



Надзея Яноўская



Андрэй Беларэцкі



Андрэй Свеціловіч

# 2. Самахарактарыстыка



Надзея Яноўская



Андрэй Беларэцкі



Андрэй Свеціловіч

# 3. Адносіны да Бацькаўшчыны, яе гісторыі і будучыні



Надзея Яноўская



Андрэй Беларэцкі



Андрэй Свеціловіч

# 4. Адносіны да народа, да шляхты



Надзея Яноўская



Андрэй Беларэцкі



Андрэй Свеціловіч

# 5. Рысы характару, паводзіны ў крытычнай сітуацыі



Надзея Яноўская



Андрэй Беларэцкі



Андрэй Свеціловіч

# Творчае заданне

# I група

Надзея Яноўская

# II група

Андрэй Беларэцкі

# ІІІ група

*Андрэй Свецiловiч*

# Пра каго ідзе размова?








# Задачы ўрока:

- ✓ахарактарызаваць герояў аповесці па іх паводзінах, учынках, выказваннях;
- ✓вызначыць ролю вобразаў у раскрыцці ідэі твора



# Дамашняе заданне:

1. Паразважаць над сімвалічнасцю словазлучэння “дзікае паляванне”.

2. Прачытаць раздзелы 1, 2, 3, 4 з рамана Ул.Караткевіча “Каласы пад сярпом тваім”. Звярнуць увагу на абрад дзядзькавання.


Дзякуй за ўвагу!


Уладзімір Караткевіч
“Дзікае паляванне караля Стаха”